# Беларусь у палітычных планах Ю. Пілсудскага вясной 1919 г.

*Марозаў А. Л., маг. ГДУ ім. Ф. Скарыны,*
*навук. кір. праф. Лазько Р. Р., д-р гіст. навук*

Падзеі вясны 1919 г. займалі значнае месца ў фарміраванні палітычнай канцэпцыі Ю. Пілсудскага адносна Беларусі. У гэты час непасрэдна пачынаецца рэалізацыя яго так званай усходняй палітыкі, у аснове якой ляжала ідэя федэратыўнага аб'яднання народаў былой Рэчы Паспалітай.

Вясной 1919 г. Юзаф Пілсудскі як кіраўнік Польскай дзяржавы вёў свае войскі на Беларусь, ажыццяўляючы палітыку «здзейсненых фактаў», мэтай якой было аслабленне Расіі, яе «адкідванне» як найдалей на ўсход [1, с. 110]. Напярэдадні выправы на Вільню Пілсудскі паведаміў пра яе свайму паплечніку Васілеўскаму: «Дапускаю, што ў найбліжэйшым часе я змагу прыадчыніць крыху дзверы ў палітыку, звязаную з Літвой і Беларуссю. Табе вядомыя мае погляды ў гэтай справе, сэнс якіх у тым, што я не хачу быць ані імперыялістам, ані федэралістам, пакуль не маю магчымасці выказвацца ў гэтых справах з нейкай хаця б павагай ды рэвальверам у кішэні. У святле таго, што на ўсім божым свеце пачынае, здаецца, перамагаць балбатня аб брацтве народаў і амерыканскія дактрынкі, я ахвотна схіляюся ў бок федэралістаў» [2, с. 62].

Уязджаючы ў горад, Пілсудскі разлічваў, што Вільня стане тым «магнітам», які будзе прыцягваць да сябе ўсю гістарычную Літву, выконваючы такім чынам важную ролю ў ажыццяўленні федэратыўных планаў, таму невыпадкова свой зварот да мясцовага насельніцтва Пілсудскі назваў «Да жыхароў былога Вялікага княства Літоўскага» [1, с. 111].

У звароце Пілсудскі, між іншым, адзначаў наступнае: «Хачу Вам даць магчымасьць разьвязаць унутраныя нацыянальныя і рэлігійныя справы так, як самі захочаце, без якога-небудзь гвалту або націску з боку Польшчы… Уводжу цывільны урад, у які запрашу мясцовых людзей…Мэты Цывільнага Ураду ў тым, каб дапамагчы жыхарам гаварыць аб сваіх патрэбах праз свабодна выбраных прадстаўнікоў… Клапаціцца аб усіх, бяз розьніцы веры і нацыянальнасьці» [3, с. 83–84].

Але ў сваёй адозве Ю. Пілсудскі абмінае шэраг пытанняў адносна будучыні занятай яго войскам беларускай тэрыторыіі. Такі стан спраў быў выкліканы, сярод іншых прычын, адсутнасцю ў Вільні на той момант скансалідаванага асяродка беларускага ці літоўскага або польскага нацыянальнага руху. У сваім лісце да І. Падарэўскага ад 4 мая сам кіраўнік польскай дзяржавы адзначыў: «Вільню я знайшоў пакінутай як палякамі, так і літвінамі і беларусамі, я не магу ўтварыць тут што-небудзь значнае пасля заняцця Вільні. І палякі, і літвіны, і беларусы пры перагаворах з імі азіраліся: адны — на Варшаву, другія — на Коўна ці Мінск, куды эміґравала большасць іх прадстаўнікоў. У выніку я спыніўся на такім вырашэнні праблемы, якое б не закрывала дарогі ні ў адным напрамку»

[4, с. 292–293]. Такім чынам, Ю. Пілсудскі пакідаў месца для манеўра ў выпадку змены ваеннай і палітычнай сітуацыі. Аднак мае пад сабой падставу і меркаванне К. Гамулкі, якое яна выказвае адносна таго, што словы Пілсудскага аб магчымасці вырашэння ўнутраных, нацыянальных і канфесійных спраў самімі беларусамі — так, як яны захочуць — былі выкліканы жаданнем стварыць адпаведнае ўражанне сярод удзельнікаў Парыжскай мірнай канферэнцыі і не былі адлюстраваннем сапраўдных поглядаў Пілсудскага [2, с. 63].

Адносіны ж з беларусамі для Пілсудскага, на яго думку, складваліся дастаткова спрыяльна. У лісце да генерала С. Шэптыцкага ад 15 мая ён адзначаў: «З беларусамі ўдасца зрабіць амаль што ўсё, што мы хочам, перш за ўсё, выклікаць якую-небудзь заяву на карысць сувязі з Польшчай супраць расійскага імперыялізму і супраць тэндэнцый з Коўна». У сувязі з гэтым, на думку маршалка: «У адносінах да беларускага насельніцтва нашым дзеянням трэба надаваць усе знешнія выявы даверу і выразнай гуманнасці». Далей Ю. Пілсудскі адзначаў: «Я ж мяркую, што такі спосаб дзеянняў у сувязі з выдатнай пасіўнасцю характару мясцовага насельніцтва і выхаванай на працягу стагоддзяў схільнасцю падпарадкоўвацца кожнаму знешняму націску не ўяўляе ніякай небяспекі ні для войска, ні для дзяржаўнай палітыкі» [5, с. 298–299].

Відавочна, што насуперак створанаму ў гістарычнай літаратуры вобразу Пілсудскага як прыхільніка федэратыўнай канцэпцыі ў адносінах да беларускіх зямель, сам маршалак дзейнічаў у фарватары палітыкі «здзейсненых фактаў» і адштурхоўваўся ад існуючай ваенна-палітычнай кан’юктуры. Існуючы стан спраў дазваляў Ю. Пілсудскаму быць асцярожным адносна вырашэння пытання беларускай дзяржаўнасці на занятай палякамі тэрыторыі і не прымаць якіх-небудзь кардынальных рашэнняў у гэтым накірунку, каб у спрыяльны момант вырашыць беларускую справу як мага выгадней для Польскай дзяржавы.

**Літаратура**

1. Лазько, Р. Спробы заключэння беларуска-польскага саюза ў 1919 годзе / Р. Лазько // Беларускі гістарычны зборнік.— 2001.— № 15.— С. 109–121.

2. Гамулка, К. Паміж Польшчай і Расіяй. Беларусь у канцэпцыях польскіх палітычных фарміраванняў (1918–1922) / К. Гамулка.— Вільня: Палітычная сфера, 2008.— 256 с.

3. Odezwa do mieszkańców byłego Wielkiego Księstwa Litewskiego z 22 kwietnia 1919 // Jozef Pilsudski. Mysli, mowy i rozkazy.— Warszawa: Wydawnictwo Kwadryga, 1989.— С. 83–84.

4. Ліст кіраўніка польскай дзяржавы Ю. Пілсудскага прэм’ер-міністру І. Падарэўскаму па пытанні польскай палітыкі адносна Літвы і Беларусі // Беларусь у палітыцы суседніх і заходніх дзяржаў (1914–1991 гг.): зб. дакументаў і матэрыялаў: у 4-х т. Т. 1 / рэдкал.: С. М. Мартынаў [і інш.].— Мінск: Юніпак, 2008.— 539 с.

5. Вытрымкі з ліста кіраўніка польскай дзяржавы Ю. Пілсудскага генералу С. Шэптыцкаму аб палітыцы Польшчы на Усходзе ад 15 мая 1919 года // Беларусь у палітыцы суседніх і заходніх дзяржаў (1914–1991 гг.): зб. дакументаў і матэрыялаў: у 4-х т. Т. 1 / рэдкал.: С. М. Мартынаў [і інш.].— Мінск: Юніпак, 2008.— 539 с.

# Формы политического участия

*Михайловский В. С., асп. БГУ,*
*науч. рук. Старовойтова Л. В., канд. фил. наук, доц.*

Среди базовых для политической науки понятие «политическое участие» занимает важное место. Оно понимается как вовлеченность индивидов или групп в процесс политико-властных отношений. Участие в политике выражается в двух основных формах: прямой и опосредованной. Типами политического участия являются: участие в делегировании полномочий; участие в деятельности политических и иных организаций; выполнение политических функций в рамках государственных и иных политических институтов; прямые действия (участие в митингах, демонстрациях и т. д.). Политическое участие есть проявление и реализация политического поведения, которое определяется как присущее индивидам взаимодействие с политической средой.

С точки зрения традиционных представлений в основе политического участия лежит политическое действие. Оно есть сознательное и добровольное вмешательство индивида или группы в отношения власти. Политическому действию, как разновидности социального действия, присуще цель и направленность на других людей. Традиционным социально-психологическим источником политического участия является сознательная активность граждан, целенаправленно и свободно вступающих в «переговорный» процесс с властью в целом и с отдельными институтами и политиками.

Спорным в политической науке является вопрос об отнесении к политическому участию вынужденных политических действий, диктуемых принуждением, страхом, манипуляцией сознанием и другими побудительными мотивами, не предполагающими осознания политических интересов. На наш взгляд вынужденное политическое действие в мобилизационных политических системах не является политическим действием, но все же выступает формой политического участия, ибо вовлекает акторов в политико-властные отношения.

Люди активно участвующие в политике, составляют, как правило, меньшинство. Большинство же может просто интересоваться политикой или проявляет апатию и безразличие к ней. Существуют различные причины такого отношения к политике, которое проявляется в неучастии. На наш взгляд неучастие в политике, состоящее в сознательном воздержании от осуществления политических действий, является формой политического участия. Во-первых, мы исходим из того, что абсентеизм, политический бойкот является активным политическим действием и выступает тем самым как акт участия в политике; во-вторых, неучастие в политике может выступать реакцией на импульсы, исходящие от политической системы; в-третьих, крайняя политизированность современного социума позволяет трактовать любое воздержание от действия в политике и неучастие в ней как проявлением политического участия. Такое